На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№№129–130 (2857–2858)

29 жніўня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Свабода!!!

У Беларусі не засталося палітзняволеных. Услед за Аляксандрам Казуліным на волю выйшлі асуджаныя пасля студзеньскай акцыі прадпрымальнікаў Андрэй Кім і Сяргей Парсюкевіч. Першыя дні на волі — якія яны?

Андрэй КІМ: «Многія людзі носяць маскі»

Нагадаем, што ў красавіку Андрэй Кім быў асуджаны на паўтара года пазбаўлення волі, адбываў пакаранне ў бабруйскай калоніі. Як і Казулін, ніякіх указаў пра памілаванне Кім не бачыў. Ніякіх прашэнняў аб памілаванні кіраўніку дзяржавы не пісаў...

Пасля сямімесячнага прабывання за кратамі Андрэй выглядае больш-менш бадзёра, хаця турма здароўя яму не надала: у хлопца пагоршыўся зрок, і абастрыліся хваробы страўніка...

— Андрэй, давай вернемся да абвінавачвання, згодна з якім ты апынуўся за кратамі. Пасля сямі месяцаў прабывання ў "месцах не такіх аддаленых" стаўленне да прысуду не змянілася?

— Не, не змянілася. Абвінавачванне абсалютна бязглуздае, смешнае і не адпавядаючае рэчаіснасці. Крымінальная справа супраць мяне была ўзбуджана з адзінай мэтай — пасадзіць. Я ведаю, што ў КДБ супраць мяне была заведзена аператыўная справа і ў той момант, калі, на думку службістаў, там накапілася дастаткова фактаў для маёй "пасадкі", справе далі ход.

Тым не менш спадзяванне на апраўдальны прысуд было. Калі памятаеце, зімой выпусцілі з-за кратаў некаторых "палітычных", і ў мяне быў спадзеў, што гэтая хваля можа дакаціцца і да мяне. Але я застаўся за кратамі.

— У многіх уяўленне аб турме складаецца пасля прачытання кніг ці прагляду фільмаў. Ты бачыў усё сам. Адкажы, што такое сучасная беларуская турма?

— У фільмах і кнігах вельмі многа няпраўды і шмат страшнага. Пабываўшы там, я разбурыў сцяну ўласнага страху перад турмой. Па-сутнасці, там нічога страшнага няма. Умовы на Валадарцы, дзе я знаходзіўся да суда, канечне, не самыя лепшыя. Валадарка — гэта крэпасць-турма са страшнымі зводамі і металічнымі нарамі, вельмі дрэнным харчаваннем і дрэнным святлом... Але насамрэч умовы не галоўнае — галоўнае людзі, якія сярод цябе. Там, як і тут, знаходзяцца розныя людзі. Але ў турме больш ясна разумееш, што чалавек зусім не такі, якім ён хоча здавацца. Кожны чалавек носіць маску. На волі гэтаму не надаеш увагі, а за кратамі ўсё выкрываецца праз некаторы час. Людзі знаходзяцца ў адным памяшканні вельмі доўгі час. І першае ўражанне ад людзей, як правіла, зманлівае. Здаецца, вось перад табой добры чалавек, а потым ён можа, умоўна кажучы, сунуць табе нож у спіну...

— Раскажы пра ўмовы ўтрымання ў Бабруйскай калоніі?

— Для Беларусі — гэта не самы горшы варыянт. Мой распарадак дня быў наступны: пад'ём у шэсць, ранішняя паверка, потым сняданак. Дарэчы, рацыён харчавання ў турме аднолькавы — тры разы на дзень каша, а ў абед да яе давалі яшчэ суп на камбітлушчы. Адзін раз на тыдзень у зняволеных свята — давалі 100 грамаў кефіру і яйка. Але мне яйка не выдавалі на працягу ўсяго тэрміну зняволення. "Каралі" такім чынам, таму што людзі, якія не пагадзіліся з рашэннем суда і пачалі пісаць касацыі, чамусьці паўнавартаснымі зняволенымі не з'яўляюцца.

— Андрэй, падчас знаходжання ў калоніі ты змяніў ажно чатыры "месцы працы"...

— Так, але самая запамінальная з іх — гэта праца "на шэўронах". Шэўрон — гэта спецыяльная нашыўка на міліцэйскую ці спецназаўскую форму. У тым ліку я займаўся і тым, што рабіў нашыўкі для СОБРа, якім кіруе Дзмітрый Паўлічэнка.

Гэтая праца вельмі складаная, цяжкая для вачэй. У турме, дарэчы, я добра "пасадзіў" зрок. Зараз у мяне — мінус шэсць. За працу ў турме плацяць — калі выконваеш норму, то можаш атрымаць у месяц па 800 беларускіх рублёў. Такім чынам, каб сабраць 10.000 рублёў, трэба адпрацаваць больш за год... Але норму выканаць не так проста, у мяне атрымлівалася не заўжды...

— А праблем з тамтэйшым кантынгентам не было?

— Насамрэч праблема не ў "блатных" — іх у бабруйскай турме амаль не засталося. І яны, як гэта ні дзіўна, жывуць па гонары. А вось са "стукачамі", якіх таксама хапае і якія працуюць на адміністрацыю, я стараўся быць асцярожным. Менавіта ад іх сыходзіла галоўная для мяне небяспека. З іх боку ў дачыненні да мяне былі разнастайныя правакацыі — і на бойку правакавалі, і наркотыкі падкідвалі...

Увогуле, людзі, якія спрабавалі весці дыялогі на палітычныя тэмы, выклікалі ў мяне засцярогу. Дарэчы, мяне вельмі моцна кантралявалі — асабліва ў апошні час. Адміністрацыя ведала літаральна пра кожны мой крок — дзе я, што раблю, з кім размаўляю...

— Прайшла інфармацыя аб тым, што амаль перад самым вызваленнем ты трапіў у "штрафбат"... За што?

— Гэта не штрафбат, а так званы гаспадарчы атрад... Там утрымліваюцца людзі, якіх асудзілі за "непрыгожыя артыкулы", альбо людзі, якія працуюць на адміністрацыю. Напрыклад, у гэтым атрадзе знаходзіўся былы амапавец, які разганяў людзей з плошчы ў 2006 годзе, а ў турму трапіў за згвалтаванне дзіцяці. Там такіх не любяць. На зоне яго "апусцілі", кажучы больш прыстойна — быў зніжаны ягоны сацыяльны статус шляхам фізічнага ўздзеяння... А я ў гэты атрад трапіў па распараджэнні адміністрацыі. Перавялі, на маю думку, таму, што ў гэтым атрадзе, які адгароджаны ад жылой зоны, лягчэй пазбавіць магчымасці размаўляць з іншымі зняволенымі... Ім там было прасцей мяне кантраляваць...



— Разуменне таго, што цябе хутка выпусцяць, прыйшло пасля вызвалення Казуліна?

— Так. Аб вызваленні Аляксандра Уладзіслававіча я даведаўся ў той жа вечар — у бабруйскую калонію сталі тэлефанаваць журналісты, з пытаннем "Калі вызваляць Кіма?". У дзень майго вызвалення да мяне прыйшлі супрацоўнікі адміністрацыі і сказалі, што ў мяне ёсць сем хвілін на зборы... Падганялі... На выхадзе з барака мяне чакаў начальнік калоніі. Далі 10.000 на дызель да Мінска, і я паехаў...

— Зараз ты на волі, чым плануеш займацца?

— Пакуль не ведаю, хачу агледзецца і прыйсці ў сябе. Трэба заняцца здароўем — лячыць зрок і гастрыт, які абвастрыўся ў турме.

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

Сяргей ПАРСЮКЕВІЧ: «Навошта ж нас памілавалі, калі мы не былі палітзняволенымі?»

Палітзняволены Сяргей ПАРСЮКЕВІЧ выйшаў на волю адным з апошніх, хоць прашэнне аб памілаванні ён таксама не пісаў. Аб чым віцебскі прадпрымальнік і расказаў у інтэрв'ю "Народнай волі"...

— Дзіўная атрымліваецца гісторыя, — кажа мой суразмоўца. Прашэнне аб памілаванні я не пісаў, аднак Аляксандр Лукашэнка аддае загад мяне выпусціць з турмы. У той жа час ён заяўляе, што ў нас за кратамі палітзняволеных не было і няма. Маўляў, сядзяць толькі "крымінальныя элементы". Дык ён што, зараз проста так выпусціў на свабоду трох "крыміналаў"? Мяне, Андрэя Кіма і Аляксандра Казуліна... Чаго ж мы выйшлі тады, калі нават самі аб гэтым не прасілі? Зрэшты, з майго боку і на самай справе ніякага крыміналу не было — я яшчэ і сам быў пацярпелым. Думаю, што такія ж сітуацыі і з Кімам, і з Казуліным. Ды і наогул у калоніях шмат людзей, якія сядзяць нізашто. Дарэчы, я ведаў, што не затрымаюся ў калоніі ўжо тады, калі на волю быў адпушчаны Аляксандр Казулін.

— Як адміністрацыя калоніі ставілася да вас?

— "Выкідвалі" з калоніі настолькі хутка, што я нават не паспеў сабраць сваю бялізну. Апошні ж час я знаходзіўся ў мінскай турме, куды мяне перавялі са Шклова. Але ў Шклове пачувалася больш камфортна, калі можна так сказаць аб знаходжанні ў няволі. Там я быў у паказальным атрадзе, больш-менш прыстойныя былі і бытавыя ўмовы. Калі не лічыць, што на тры атрады была адна прыбіральня і па патрэбе даводзілася "лётаць" з трэцяга паверха на першы. Зрэшты, усё гэта дробязі. Самае цяжкае — гэта зневажэнне тваіх гонару і годнасці, стараюцца апусціць як мага ніжэй. Такім чынам, напэўна, хочуць перавыхаваць, але атрымліваецца ўсё наадварот. Людзі становяцца вельмі злымі.

— Сяргей, раней вы працавалі ў міліцыі. Не было з-за гэтага праблем з асуджанымі на "зоне"?

— Не хачу хваліцца, але там я наогул карыстаўся аўтарытэтам. Да мяне прыходзілі за парадамі, самі прапаноўвалі дапамогу. Там жа адразу бачна, што ты за чалавек. Калі і на волі — бруд, то гэтага не схаваць нідзе. Так што астатнія зняволеныя ведалі і хто я, і за што сяджу. Прыносілі гарбату, каву, прэсу... У мяне заўсёды быў поўны набор незалежнай друкаванай прадукцыі — "Народная воля", "Наша Ніва", "Беларусы і рынак"... Там у гэтым плане, калі якая праблема і паўставала, то толькі для таго, каб была своечасова вырашана.

— Вашы блізкія расказвалі, што былі ў вас вялікія праблемы і са здароўем...

— У калоніі гэта хвалявала ўжо не так. А вось падчас суда і следства... Для мяне гэта быў вельмі сур'ёзны стрэс! Уявіце сабе, што невінаватага чалавека хапаюць на вуліцы і кідаюць у турму. Тут аніякае здароўе не вытрымае. Зараз трэба будзе ім заняцца.

— Якія планы яшчэ?

— Пацiху прыходжу ў форму. За гэты тыдзень займаўся не толькі здароўем і сям'ёй, але і сустракаўся з прадпрымальнікамі, пабываў на рынку, праводзіў прыватныя гутаркі. Вельмі шмат было тэлефанаванняў мне. Абмяркоўваем, што рабіць далей і што можна змяніць. У бліжэйшы час планую заняцца тым, каб нейкім чынам аб'яднаць прадпрымальнікаў. Таму што ёсць пэўныя праблемы. Трэба сабрацца ўсім разам, каб стварыць нейкі каардынацыйны штаб прадпрымальнікаў. Усе ж разумеюць, што мы робім адну справу, аднак робім па-рознаму. І нярэдка толькі перашкаджаем адзін аднаму. А з гэтым трэба "завязваць". Акрамя таго, думаю вярнуцца ў бізнес. Трэба ж нейкую капейку і для сям'і зарабіць.

— Сяргей, многія, хто пабываў за кратамі, робяць там нейкія нататкі, якія затым збіраюцца надрукаваць...

— Ведаеце, я ў гэтым плане, напэўна, не выключэнне. У мяне ўжо ўсё практычна падрыхтавана — застаецца толькі літаратурна аформіць. Зрэшты, я не лічу патрэбным апісваць, як там усё канкрэтна адбывалася, але агульную карціну свайго знаходжання ў няволі апісаць хачу. Я пісаў практычна кожны дзень лісты, таму скласці нататкі зараз не складана. Можна нават браць адзін да аднаго. Адзінае, што не ведаю, калі дойдуць рукі да таго, каб сесці і ўсё напісаць. Зараз вельмі шмат спраў.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Інфармацыя па справе

У міліцыі Сяргей Парсюкевіч праслужыў 8 гадоў, стаўшы экспертам у розных відах зброі і ў грошах. Па стане здароўя давялося звольніцца.

У 2003 годзе стаў індывідуальным прадпрымальнікам. Пачынаў сезонным гандляром на Смаленскім рынку Віцебска. Затым быў абраны старшынёй рады рынку.

У палітыку ўключыўся ў 2006 годзе, падчас прэзідэнцкіх выбараў уступіў у ініцыятыўную групу Аляксандра Мілінкевіча.

Калі быў падпісаны указ, які абмежаваў правы прадпрымальнікаў наймаць працаўнікоў, Сяргей Парсюкевіч стаў на бок тых, хто вырашыў змагацца за ягоную адмену.

За ўдзел у мітынгу 10 студзеня Сяргей Парсюкевіч быў пакараны адміністрацыйным арыштам. Падчас яго адбыцця ў турме на Акрэсціна з ім і здарыўся інцыдэнт, які лёг у аснову крымінальнай справы. Суд палічыў, што гэта Сяргей Парсюкевіч у турме збіў ахоўніка. Між тым сам прадпрымальнік называў гэтыя абвінавачанні абсурднымі і тлумачыў, што гэта міліцыянер пачаў яго збіваць, а ён толькі адштурхнуў ахоўніка, баронячы сваё жыццё.

Маскоўскі суд г.Мінска пакараў прадпрымальніка Сяргея Парсюкевіча двума з паловай гадамі турмы.

ПЕРАМОВЫ

Расіяне патрабуюць кантрольны пакет

Пры куплі беларускіх прадпрыемстваў нафтахімічнай галіны "Нафтан" і "Палімір" расійскія кампаніі будуць настойваць на атрыманні кантрольнага пакета акцый. Пра гэта паведаміў пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў.

Ён нагадаў, што цікавасць да гэтых прадпрыемстваў, якія трапілі ў спіс для прыватызацыі, выказваюць "Лукойл" і "Роснефть". "Нашы кампаніі зацікаўлены ў кантрольным пакеце — як мінімум 51%. Яны будуць настойваць на пакеце, што дае магчымасць прымаць рашэнне, каб не было такіх дробных сварак, якія мы маем цяпер на прыкладзе СП "Белтрансгаз", дзе ўласнасць належыць 50 на 50", — падкрэсліў дыпламат.

Нагадаем, расійскі бок выстаўляе прэтэнзіі беларускаму боку адносна збірання непадатковых адлічэнняў з ААТ "Белтрансгаз" у беларускія дзяржаўныя фонды. 6 жніўня на прэс-канферэнцыі А.Сурыкаў зазначыў, што ў 2006 годзе адлічэнні ў інавацыйны фонд складалі 0,25%, у 2007 годзе Мінэнерга Беларусі павялічыла іх да 8,1%, а з 2008 года яны склалі 19%. Паводле яго слоў, у працэсе перамоў бакі вырашылі, што з другога паўгоддзя 2008 года працэнт адлічэнняў будзе 8,1. Аднак расійскі бок абяцаў вярнуцца да гэтай тэмы.

Паводле слоў А.Сурыкава, ацэнка беларускіх прадпрыемстваў "Нафтан" і "Палімір" яшчэ наперадзе. "Колькі яны будуць каштаваць, аднаму богу вядома — пра розныя сумы ідзе гаворка. Вядома толькі, што яны будуць не маленькімі", — сказаў пасол. Якая з расійскіх нафтавых кампаній прапануе больш выгаднае эканамічнае рашэнне беларускаму боку, тая, паводле меркавання дыпламата, і "будзе пераможцам". Пры гэтым ён зазначыў, што ёсць "уражанне, што ў працэсе акцыянавання "Нафтан" і "Палімір" могуць аб'яднацца".

Нагадаем, яшчэ 1 жніўня на прэс-канферэнцыі першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка паведаміў, што расійская нафтавая кампанія "Лукойл" падасць тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне па ўдзеле ў праектах у нафтахімічным комплексе Беларусі ў жніўні, а "Роснефть" — у кастрычніку.

Наталля КАРОТКАЯ.

ФАКТ І КАМЕНТАРЫЙ

ЦВК: закон не забараняе заклікаць да байкоту выбараў

Выбарчая кампанія ў Беларусі набірае ход. І амаль кожны дзень паступаюць паведамленні аб затрыманні міліцыяй актывістаў, якія заклікаюць да байкоту выбараў. То налепкі ў іх адбяруць, то ўлёткі, то з вобыскам прыйдуць, то ў пастарунак зацягнуць...

У сувязі з гэтым "Народная воля" звярнулася ў Цэнтрвыбаркам за тлумачэннямі. Мы пацікавіліся, ці забараняе беларускі закон заклікаць да байкоту выбараў?

У арганізацыйна-прававым аддзеле ведамства Лідзіі Ярмошынай нам адказалі: "У законе такой нормы на сённяшні дзень не ўтрымліваецца".

Гэта значыць, што заклікаць да байкоту можна. Тады выклікае сумненне законнасць дзеянняў прадстаўнікоў міліцыі, якія з зайздросным пастаянствам "адлоўліваюць" людзей, якія нясуць у грамадства "байкотныя" настроі...

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Са святам?

1 верасня — Дзень ведаў

Традыцыйна 1 верасня ў школах Беларусі пачынаецца новы навучальны год.

У гэтым годзе будзе ўсё, як заўсёды: белыя банты, кветкі, узрушаныя вучні і настаўнікі. Будзе звінець першы школьны званок для амаль 93 тысяч першакласнікаў. Але... Гэты навучальны год увойдзе ў гісторыю беларускай школы як год самага хуткаснага і рызыкоўнага школьнага эксперыменту, ацаніць які нам яшчэ давядзецца. З гэтага навучальнага года 91 школа Беларусі спыніць сваё існаванне, шэраг настаўнікаў застанецца без працы.

Але ўсё ж такі... Мы выказваем словы падзякі беларускім педагогам, якія ў гэтай ненармальнай сітуацыі працягваюць нармальна працаваць. Віншуем з 1 верасня нашых дзяцей! А разам з віншаваннямі зычым ім і настаўнікам цярпення, мужнасці і поспехаў...

(Працяг тэмы на 4-й старонцы.)

ВІЗІТ

Жанна ЛІТВІНА: «Сёння беларускія сродкі масавай інфармацыі не могуць збіраць і даносіць інфармацыю да выбаршчыкаў...»

На мінулым тыдні Мінск наведаў памочнік намесніка дзяржсакратара ЗША ў справах Еўропы і Еўразіі Дэвід Меркель.

Ён правёў шэраг сустрэч з прадстаўнікамі афіцыйнай улады, апазіцыі, грамадскіх арганізацый.

У Адміністрацыі прэзідэнта і ў амбасадзе ЗША вынікі гэтых сустрэч не каментуюць. Міністэрства замежных спраў абмежавалася наступным паведамленнем: "Бакі абмеркавалі шляхі і крокі да паляпшэння стасункаў." Але нават такая скупая інфармацыя сведчыць, што беларуска-амерыканскія кансультацыі пачаліся...

Дэвід Меркель у інтэрв'ю журналістам заявіў, што маючыя адбыцца выбары ў Беларусі вельмі важныя: *"Калі ўлады створаць спрыяльныя ўмовы: і кандыдаты, і выбаршчыкі змогуць прымаць удзел у выбарах, гэта будзе крокам да паляпшэння стасункаў".*

Спадар Меркель адзначыў, што амерыканскі бок будзе сачыць за ходам выбарчай кампаніі: за рэгістрацыяй кандыдатаў, за ўмовамі іх доступу да выбаршчыкаў, складам выбаршчыкі. Таксама амерыканскі бок клапоціцца станам здароўя зняволенага ў Беларусі грамадзяніна ЗША Эмануіла Зельцэра. Спадар Меркель заявіў, што амерыканскі бок пасля вызвалення палітвязняў будзе вітаць іншыя крокі афіцыйнага Мінска.

Былы намеснік міністра замежных спраў **Андрэй Саннікаў** лічыць візіт Дэвіда Меркеля вельмі важным для Беларусі.

"Падчас сустрэчы гаварылася пра небяспеку прызнання беларускага рэжыму ў яго існуючым выглядзе, — расказаў Саннікаў прэс-цэнтру Хартыі-97. — *Гэта законсервуе альбо нават пагоршыць сітуацыю ў Беларусі. Большасць удзельнікаў сустрэчы з Меркелем адзначалі прынцыповую і паслядоўную пазіцыю ЗША па пытаннях захавання правоў чалавека. На мой погляд, ЗША адыгралі вядучую ролю ў вызваленні беларускіх палітзняволеных."*

У Амерыкі ёсць спадзяванні, што ў Беларусі магчыма нейкая дэмакратызацыя, што на нейкія крокі будзе зроблена паляпшэнне клімату на выбарах, — так лічыць палітык **Мікола Статкевіч**.

"Акрамя таго, Амерыка хацела б, безумоўна, аднавіць дзейнасць сваёй амбасады, — казаў Статкевіч журналістам пасля сустрэчы з Меркелем. — *І таму калі ўлада адпусціла палітвязняў, адразу скарысталі гэту магчымасць, каб знізіць напружанасць у адносінах. Але спадзяванні на тое, што выбары будуць выбарамі хоць у невялікай ступені — абсалютна марныя. Але ў любым выпадку такія кантакты — гэта добра для ўлады. Бо гэта дае магчымасць прыбраць эканамічныя санкцыі. І самае галоўнае — гэта выдатны козыр на перамовах з Расіяй. Улада атрымала выдатны шанс, дзякуючы гэтаму візіту, паменшыць кошт на газ на наступны год".*

"Разлічваць на нейкія прынцыповыя зрухі ў бок дэмакратызацыі не даводзіцца, пакуль не будзе зменена палітыка ўлад у дачыненні да СМІ". Такую думку выказала старшыня ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" **Жанна Літвіна** ў час сустрэчы з намеснікам памочніка дзяржаўнага сакратара ЗША ў справах Еўропы і Еўразіі Дэвідам Меркелем.

"Была агучана тэза пра тое, што, на жаль, сёння беларускія сродкі масавай інфармацыі не могуць у поўнай меры выконваць свайго канстытуцыйнага прызначэння — збіраць і даносіць інфармацыю да выбаршчыкаў, — зазначыла старшыня БАЖ. — *Сітуацыя не зменіцца прынцыпова, пакуль будзе існаваць дзяржаўная прэса, якую прымушаюць выконваць прапагандысцкую функцыю, а ў дачыненні да недзяржаўнай будзе ажыццяўляцца палітыка эканамічнай дыскрымінацыі".*

Як паведамляе прэс-служба БАЖ, Дэвіда Меркеля праінфармавалі пра праблемы, якія існуюць у недзяржаўных СМІ з распаўсюджваннем і друкаваннем у Беларусі. Акрамя таго, яго азнаёмілі з прамежкавымі вынікамі маніторынгу асвятлення выбарчай кампаніі ў СМІ. З іх, нагадаем, вынікае, што тэма выбараў не з'яўляецца для дзяржаўных медыя прыярытэтнай, а ў якасці асноўных суб'ектаў выбарчага працэсу ў іх матэрыялах выступаюць ЦВК і кіраўнік дзяржавы.

Паліна ПЯТРОВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 ЖНІЎНЯ 2008 г.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

Сышліся ў судзе

Карэспандэнт "Народнай волі" пабываў у Кобрыне на судовым працэсе па справе прэтэндэнта на дэпутацкі мандат Аляксандра Меха.

Што-што, а суды ў Беларусі будаваць умеюць. Будынак суда Кобрынскага раёна выглядае даволі прэзентабельна як звонку, так і ўнутры. І ў адрозненне ад Мінска, дзе "палітычныя" справы выклікаюць цікавасць з боку прадстаўнікоў спецслужб, у Кобрыне ў гэтым сэнсе ўсё было спакойна. Старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі, які разам з іншымі прадстаўнікамі партыі прыехаў падтрымаць Аляксандра Меха, нават пажартаваў: "Міліцыі ў судзе так мала, што пры жаданні тут можна праводзіць партыйныя сходы і ніхто не будзе супраць..."

...Разгляд справы сябра Партыі БНФ Аляксандра Меха распачаўся ў зале, дзе звычайна разглядаюць "крыміналку". У прасторным светлым памяшканні стаіць клетка для злачынцаў. (І, дарэчы, за дызайнерскае рашэнне ў афармленні гэтай самай клеткі аўтара можна пахваліць: жалезныя пруты выраблены ў "мастацкім" стылі — з прыгожымі завітушачкамі на канцах.) Ці гэта быў намёк Меху, ці выпадковасць — не ведаю.

І ўсё ж у адрозненне ад Аляксандра Меха, які ў рэшце рэшт справу прайграў, нешматлікія прысутныя журналісты ў думках аддзячылі суддзі Кобрынскага раённага суда Аляксандру Бабаскіну: ён не забараніў ні аўдыёзапіс працэсу, ні фота- і відэаздымкі ў судовай зале. Карацей, мінскім калегам Бабаскіна ёсць да чаго імкнуцца...

"Народная воля" неаднаразова пісала пра сітуацыю, у якой апынуўся інжынер Кобрынскага ўпраўлення магістральных газаправодаў, сябра Партыі БНФ Аляксандр Мех. Коратка нагадаем сутнасць справы. З пасады інжынера Мех быў звольнены 30 чэрвеня. І сам ён, і праваабронцы звязваюць гэтае звальненне з намерам Аляксандра балатавацца ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў.

Наша газета таксама знаёміла сваіх чытачоў з раздрукоўкай размовы, якая адбылася ў кабінеце начальніка Кобрынскага ўпраўлення ТАА "Белтрансгаз" Уладзіміра Галашкі, на якой прысутнічаў начальнік Кобрынскага ўпраўлення КДБ Андрэй Басько. Як сведчыць аўдыёзапіс, гэтыя людзі спрабавалі адгаварыць Меха ад удзелу ў парламенцкай кампаніі, адкрыта заявілі яму, што ўдзел у выбарах будзе каштаваць яму працы. Мех адмовіўся ад "своеасаблівай" прапановы і ў рэшце рэшт быў звольнены. Здавалася б, якія яшчэ патрэбны доказы, каб звязаць звальненне з пераследам за палітычную актыўнасць, што забаронена па законе?.. І Мех звярнуўся ў суд.

Інтарэсы істца ў судзе прадстаўляў грамадскі абаронца Уладзімір Малей. Кобрынскае ўпраўленне ТАА "Белтрансгаз" абараняла юрыст з галаўнога офіса прадпрыемства Аксана Мельнікава, хаця ў зале прысутнічаў і начальнік Кобрынскага ўпраўлення ТАА "Белтрансгаз" Уладзімір Галашка. Аляксандр Мех, праўда, хадайнічаў і аб выкліку ў якасці сведкі яшчэ аднаго непасрэднага фігуранта справы — начальніка Кобрынскага КДБ Андрэя Басько, але той у суд не прыйшоў, ды і суддзя Бабаскін настойваць на яго абавязковай прысутнасці не стаў.

Такім чынам, працэс, якім зацікавіліся і прадстаўнікі краін СНД, якія ўжо прыехалі назіраць за беларускімі выбарамі, і назіральнікі ад АБСЕ, пачаўся...

Мех адразу пацвердзіў свае іскавыя патрабаванні: ён настойваў на аднаўленні на ранейшым месцы працы, патрабаваў ад адказчыка выплаты грошай за вымушаны прагул (на дзень судовага разбіральніцтва яна складала 3 мільёны 445 тысяч рублёў), таксама прасіў выплаты маральнай кампенсацыі ў памеры 1 мільёна рублёў, патрабаваў прыпыніць пераслед па палітычных матывах. Адказчык, зразумела, з іскам не пагадзіўся і патрабаванні Меха не прызнаў. Маўляў, звычайнае звальненне, ніякай палітыкі!

Алесь Мех (злева) са сваім абаронцам Уладзімірам Малеем.

Прадстаўнікі адказчыка: справа на здымку Уладзімір Галашка.

Падчас судовага разбіральніцтва…

Адна з галоўных прычын, якая даказвае, што звальненне Меха было палітычна матываваным, безумоўна, аўдыёзапіс ягонай размовы з кадэбэшнікам Басько і начальнікам Галашкам. Суддзя Бабаскін уважліва прачытаў "Народную волю", дзе была раздрукоўка гэтай размовы, задумаўся, і раптам запытаўся: "А дзе канкрэтна зафіксавана, што вам пагражалі звальненнем з працы ў выпадку ўдзелу ў выбарчай кампаніі?"

Аляксандр не разгубіўся і працытаваў словы Галашкі: "Стоит ли работу и семью ставить на карту ради каких-то единовременных политических амбиций..." А словы прадстаўніка КДБ Басько "вы с нами или против нас" увогуле расцаніў як прамую пагрозу... Дарэчы, менавіта так, у рэдакцыі, палічылі і мы.

Канечне, любыя прадастаўленыя суду доказы суддзя трактуе сам, аднак Аляксандр Бабаскін (напэўна, каб не заблытацца) увогуле вырашыў не далучаць да справы раздрукоўку гэтай размовы. Суд спаслаўся на тое, што... запіс здабыты з парушэннем заканадаўства, ажыццяўляўся тайна і таму доказам не з'яўляецца... Складваецца класічная сітуацыя, калі фармальна суд правы, а па сутнасці — творыць беззаконне. Бо кожнаму зразумела, што выпадковая размова з супрацоўнікам КДБ можа быць запісана таксама толькі выпадкова.

Такім чынам, суддзя лоўка вывеў справу з разраду палітычных у шэраг звычайных працоўных спрэчак.

І тут ужо "саліравала" прадстаўніца ТАА "Белтрансгаз" Аксана Мельнікава. Яна нават не спынялася на палітычным аспекце справы, а ціснула толькі на працоўныя зносіны паміж істцом і адказчыкам. Адным з галоўных яе довадаў стала тое, што Аляксандр Мех уласнаручна падпісаў загад аб сваім звальненні і не выказаў пры гэтым ніякіх заўваг... Акрамя таго, яна адзначыла, што сам Мех не напісаў заяву аб тым, што хоча, каб кантракт з ім быў працягнуты. "Трэба меркаваць, што калі Мех не напісаў такой заявы, то ён пагадзіўся з намерамі наймальніка", — адзначыла Аксана Мельнікава.

Як я разумею, Мех увогуле не ведаў, што якія-небудзь заявы трэба пісаць. Проста таму, што за шмат гадоў працы не пісаў іх ніколі. Дый ніхто з ягоных калег іх не пісаў...

У адрозненне ад Мельнікавай, непасрэдны начальнік Меха Уладзімір Галашка ў судзе быў нешматслоўным. На пытанне суддзі, чаму працоўны кантракт Меха не быў працягнуты, Галашка коратка адказаў: "Гэта права наймальніка".

Як вядома, працаўніка ад наймальніка абараняе прафсаюз. Грамадскі абаронца Аляксандра Меха Уладзімір Малей у ходзе судовага разбіральніцтва звярнуў увагу на наступнае: "Згодна з калектыўнай дамовай, якую падпісваюць наймальнік і прафсаюз, у выпадку звальнення супрацоўніка наймальнік абавязуецца не прымаць канчатковых рашэнняў без папярэдняга ўведамлення і ўзгаднення з прафесійным саюзам, у выпадку, калі гэтыя рашэнні істотна краналюць інтарэсы супрацоўніка. У тым ліку звязаныя з прыпыненнем працоўнага кантракта.

Наймальнік 3 чэрвеня паведаміў Меху, што той будзе звольнены 30 чэрвеня, а толькі на наступны дзень прафсаюзны камітэт даў сваю згоду..."

Аксана Мельнікава адразу ж назвала спасылку на "прафсаюзную" нестыкоўку "некарэктнай". "Папярэднае ўзгадненне не прадугледжана пры прыпыненні кантракта", — заявіла яна.

Адзіным сведкам па справе праходзіў Міхаіл Касмовіч — старшыня цэхавай прафсаюзнай арганізацыі Кобрынскага ўпраўлення магістральных газаправодаў. Па ідэі, прадстаўнік прафсаюза, сябрам якога з'яўляўся Аляксандр Мех, павінен абараняць інтарэсы рабочых, але... Спадар Касмовіч пацвердзіў, што дакументы на ўзгадненне звальнення Меха былі атрыманы 4 чэрвеня. А 20-га адбылося пасяджэнне па гэтым пытанні. І Меха на гэтае пасяджэнне ўвогуле не запрасілі. Падстава ўсё тая ж: Мех не звяртаўся ў прафкам. "Саша, у мяне склалася ўражанне, што альбо выгадна табе гэта было, альбо ты нешта замышляў", — апраўдваўся перад Мехам прафсаюзны бос.

У сваю чаргу Аляксандр Мех і яго абаронца мяркуюць, што 4 чэрвеня ўвогуле ніякага пасяджэння прафкама не было. У дакументах, якія на гэты конт былі прадстаўлены суду, стаіць дата... 4 ліпеня. Аляксандр Мех напрамую абвінаваціў Касмовіча ў падлогу дакументаў, а той у сваю чаргу спаслаўся на банальны збой у камп'ютэры...

Так ці інакш суддзя Кобрынскага раённага суда Аляксандр Бабаскін вынес прадказальнае рашэнне — па ўсіх пунктах іску Меху адмовіць. "Завітушачкі" на клетцы ўсё ж не мяняюць сутнасці судовай сістэмы.

"Гэтае рашэнне, безумоўна, палітычна матываванае", — сказаў пасля вынясення прыгавору Аляксандр Мех. — Рашэнне Бабаскіна будзе абскарджана, а ў пракуратуру пададзена заява з мэтай праверкі сапраўднасці дакументаў, якія прадставіў на судзе бок адказчыка. Зараз я знаходжуся ў вельмі цікавым становішчы, бо відавочна, што працу ў Кобрыне мне будзе знайсці складана. Таму іншага выйсця, як ісці да канца, у мяне няма..."

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Кобрын—Мінск.

Белорусы не хотят идти на выборы

Как сообщила газета "Могилевские ведомости", в области накануне парламентских выборов был проведен анонимный социологический опрос с участием 1009 респондентов. Согласно опросу, лишь 53,9% респондентов заявили о своей готовности принять участие в голосовании на выборах в Палату представителей.

Среди тех, кто не намерен принимать участие в выборах, 32% — предприниматели, 23% — специалисты сельского хозяйства, 22% — студенты, 15% — рабочие. В качестве основных причин электоральной пассивности 13% назвали отсутствие программы, за которую можно голосовать. 12,9% не верят предвыборным обещаниям. 12% считают, что их голос не повлияет на результаты выборов.

Каковы шансы нынешних депутатов? 63,9% респондентов еще не определились в своих предпочтениях. 21,7% заявили, что не поддержат действующих представителей области в ППНС, 12,4% проголосуют за нынешнего депутата. При этом 80% опрошенных не смогли назвать даже фамилии действующего парламентария по своему избирательному округу.

Отдавая свои голоса, 21,3% респондентов готовы поддержать рабочего, 15,1% — представителя интеллигенции, 10,4% — руководящего работника и специалиста промышленности. 36,6% заявили, что для них профессия кандидатов в депутаты не имеет значения.

Из главных качеств будущих народных избранников 72,8% опрошенных на первое место поставили честность и порядочность, 44,9% — компетентность в экономических и правовых вопросах, 28,6% — патриотизм.

Делом Истомина занялась прокуратура

Прокуратура занимается делом представителя ОГП Юрия Истомина, который не сумел подать документы на регистрацию кандидатом в депутаты Палаты представителей.

22 августа председателя Гомельской областной организации ОГП Юрия Истомина, который намеревался выдвигаться в депутаты по Новогрудскому избирательному округу, пригласили в Новогрудскую прокуратуру.

В последний день подачи документов на регистрацию кандидатом в депутаты Ю.Истомина вместе с членами инициативной группы по сбору подписей задержала милиция Новогрудка.

Юрий Истомин полагает, что именно задержание виной тому, что не успел подать документы на регистрацию. Новогрудский райисполком в письме в адрес руководства ОГП заявляет, что Ю.Истомин сам не хотел подавать документы на регистрацию.

В любом случае этим делом занялась прокуратура.

Попков уходит из Администрации в депутаты

Заместитель главы Администрации Лукашенко Александр Попков намерен стать депутатом Палаты представителей по Сенненскому избирательному округу.

Информация об этом появилась в интернете в самом начале избирательной кампании. Однако после регистрации инициативных групп фамилии Попкова среди претендентов не оказалось и многие посчитали сообщение журналистской "уткой". И все-таки чиновник намерен сменить работу. По информации "Народной воли", подписи за выдвижение Попкова кандидатом в депутаты его инициативная группа действительно не собирала. Его выдвинули трудовые коллективы Сенненского и Толочинского районов.

Напомним, что в Администрации президента Попков курирует кадры и региональную политику. Соответственно, этот важный пост вскоре станет вакантным.

Масавы сыход чыноўнікаў у дэпутаты

У кандыдаты вылучаюцца 68 работнікаў органаў дзяржкіравання, з іх 41 — дзеючыя дэпутаты ніжняй палаты парламента.

Пра гэта БелаПАН паведамілі ў Цэнтрвыбаркаме Беларусі. Акрамя таго, дакументы на рэгістрацыю падалі 61 работнік сферы адукацыі, культуры, навукі і аховы здароўя, 5 работнікаў гандлю і бытавога абслугоўвання, 4 супрацоўнікі праваахоўных органаў і ваеннаслужачых, 36 работнікаў прамысловасці, траспарту і сувязі, 5 — сельскай гаспадаркі. 41 прэтэндэнт у кандыдаты нідзе не працуе, 68 — жанчыны, 30 — грамадзяне ва ўзросце да 30 гадоў. Збіраюцца балатавацца, у прыватнасці, намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Аляксандр Папкоў, старшыня Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Андрэйчанка, начальнік Беларускай чыгункі Уладзімір Жарэла, начальнік Ваеннай акадэміі Беларусі Ігнат Місурагін, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Глаз, старшыня Гомельскага гарвыканкама Аляксандр Бяляеў, першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Васіль Сцяпура, галоўны акушэргінеколаг Міністэрства аховы здароўя Святлана Шылава, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Пётр Южык, намеснік генеральнага дырэктара Мазырскага НПЗ Яўген Арцюшэнка, старшыня Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў Генадзь Грыцкевіч, гендырэктар ТАА "Гомельпрамбуд" Аляксандр Чыкілёў.

РОЗДУМ

Выбары без выбару

У добрапамятныя савецкія часы, згодна з афіцыйнымі паведамленнямі, вынікі "ўсенароднага" галасавання заўсёды былі ўнушальнымі — каля 90 працэнтаў выбаршчыкаў аддавалі свае галасы за кандыдатаў "блока камуністаў і беспартыйных".

Ці адпавядала такая лічба сапраўднаму волевыяўленню савецкіх грамадзян? І як з гэтым складваюцца сёння справы ў нашай краіне?

Давайце паразважаем.

Недзе ў шасцідзесятых гадах мінулага стагоддзя дырэктар адной з сярэдніх школ былога Гарадзішчанскага (цяпер Баранавіцкага) раёна распавёў мне наступнае.

Хутка пасля вайны яго ўпершыню прызначылі старшынёй участковай выбарчай камісіі. Вопыту правядзення выбараў у яго не было. Але пакуль адбывалася галасаванне, усё ішло як найлепей. Да таго часу, пакуль не давялося здаваць пратакол аб выніках галасавання ў Гарадзішчанскую акруговую выбарчую камісію.

— Старшыня акружкама глянуў на наш пратакол і кажа: "Не ўсё тут правільна. Пратакол трэба перарабіць..."

Паехаў я з сакратаркай нашай камісіі назад на свой выбарчы ўчастак. Разам з членамі камісіі старанна пераправерылі ўсе лічбы і ніякіх недакладнасцяў не выявілі. Вынік быў той жа самы.

Зноў паехалі ў Гарадзішча. Зноў паглядзеў старшыня на наш пратакол і сказаў тое ж самае, што і ў першы раз, не патлумачыўшы, у чым справа.

Я ўжо і не ведаў, што рабіць. Але раптам трапляе на вочы калега з суседняй вёскі, які таксама прывёз сюды пратакол са свайго ўчастка. Распавядаю яму пра сваю няўдачу, спадзеючыся на ягоную дапамогу — ён жа не першы год узначальваў выбарчую камісію.

Заглянуў ён у наш пратакол і кажа: "Дзівак ты чалавек! Куды сунешся са сваімі 53 працэнтамі? Прастаў у пратаколе працэнтаў 80 ці крыху болей — і ніякіх праблем у цябе не будзе..." "Але ж выбарчыя бюлетэні..." — кажу яму. "Каму патрэбны яны, твае бюлетэні? Закінуць у які-небудзь цёмны закуток на пэўны час, а потым спаляць іх. Ніхто не стане пералічваць галасы ў тых бюлетэнях..."

І я зрабіў так, як ён параіў.

Пад раніцу вярнуўся на свой участак, дзе каля накрытага стала мяне нецярпліва чакалі члены нашай камісіі. Перакуліў некалькі шклянак саракаградуснай і пайшоў дамоў адпачываць пасля бяссоннай трывожнай ночы.

— З таго часу, як я набыў вопыт афармлення выбарчых пратаколаў, сапраўды ніякіх праблем з гэтым у мяне не ўзнікала, — заўважыў напрыканцы нашай размовы мой калега-субяседнік.

Гэтая наша размова мне прыпамінаецца, калі назіраю за чарговымі выбарамі. Колькі ламаецца коп'яў у прадстаўнікоў апазіцыі і афіцыйнай улады наконт назіральнікаў! І апошнія ўважліва сочаць, як людзі апускаюць у урны бюлетэні. Але ж ці гэта галоўнае? Даўно вядома, што галоўнае не ў тым, як прагаласуюць выбаршчыкі, а ў тым, кім і як будуць падлічаны іх галасы.

А ўрэшце, калі нават з усіх выбарчых участкаў наверх паступяць самыя дакладныя звесткі аб галасаванні, яны бесперашкодна могуць быць "палепшаны" ў акруговых і Цэнтральнай выбарчай камісіях, якія прадстаўнікі той жа апазіцыі не маюць магчымасці пракантраляваць. Яскравы прыклад таму — падвядзенне вынікаў галасавання ў час выбараў югаслаўскага прэзідэнта. Мілошавіч палічыў за лепшае апынуцца за кратамі, чым дазволіць незалежнай міжнароднай камісіі пералічыць галасы. Ён ведаў, як у сапраўднасці прагаласавалі ягоныя выбаршчыкі і, каб не схібіць, не пайшоў на гэта.

І яшчэ. Неўзабаве пасля распаду СССР, калі быў адкрыты доступ да архіваў ЦК КПСС, у часопісе "Огонек" была змешчана з адпаведным каментарыем ксеракопія пастановы Палітбюро ЦК КПСС аб выніках выбараў у Вярхоўны Савет СССР, якія павінны былі адбыцца толькі праз тры дні. У ёй была зафіксавана тая ж унушальная перамога блока камуністаў і беспартыйных, прыводзіліся тыя ж унушальныя працэнты, "аддадзеныя" выбаршчыкамі за прапанаваных ім кандыдатаў. Хаця, падкрэслім, выбараў яшчэ не было.

Кіруючая партыйна-савецкая наменклатура прымала ўсе магчымыя захады для таго, каб атрымаць зададзеныя вынікі галасавання на выбарах усіх узроўняў. У гэтым я пераканаўся ўвачавідкі.

У канцы 70-х гадоў працоўны калектыў, дзе я працаваў, дэлегіраваў мяне ў склад участковай выбарчай камісіі, якая месцілася ў СШ №112 г.Баранавічы.

У дзень выбараў сям'я з чатырох чалавек, якая пражывала ў пакасіўшымся старым бараку, не з'явілася на выбарчы ўчастак. Незадоўга да заканчэння галасавання да яе з урнай накіраваліся члены нашай камісіі. Прыняць удзел у галасаванні члены гэтай сям'і катэгарычна адмовіліся з-за таго, што гарвыканкам не вырашыў іх кватэрнае пытанне. Разгублены старшыня ўчастковай камісіі патэлефанаваў "наверх", каб высветліць, як быць у дадзеным выпадку. Старшыня акруговай выбарчай камісіі, дарэчы, адказная супрацоўніца таго ж выканкама, параіла: "Выкрасліце гэтую сям'ю са спісу выбаршчыкаў, і тады гэта не паўплывае ні на працэнт яўкі на выбары, ні на працэнт прагаласаваўшых выбаршчыкаў". Так ён і зрабіў. Мне вельмі хацелася ўмяшацца ў гэта, але, усведамляючы, што адзін у полі не ваяка, не стаў клікаць на сябе бяду.

А вось цікавае назіранне з нашых прэзідэнцкіх выбараў.

Як толькі ў дзень галасавання закрыліся выбарчыя ўчасткі, старшыня Цэнтрвыбаркама Л.М.Ярмошына стала па тэлебачанні абвяшчаць вынікі галасавання на закрытых выбарчых участках — бальніцах, санаторыях, дамах састарэлых, дамах адпачынку і іншых. Пры гэтым яна падкрэслівала, што, паколькі, знаходзячыся там, выбаршчыкі прадстаўляюць зрэз розных слаёў насельніцтва — рабочых, калгаснікаў, служачых, пенсіянераў, то такія ж вынікі галасавання будуць і ў сярэднім па краіне. Па маім разуменні, гэтым яна давала зразумець старшыням нізавых камісій, што ад іх патрабуецца.

На самай жа справе вынікі галасавання ў гэтых установах нельга ўспрымаць, як усярэдненыя па краіне. У тых жа бальніцах, напрыклад, прыкаваныя да ложкаў хворыя, якія цалкам залежаць ад медыкаў, наўрад ці асмеляцца на іх вачах выкрасліць у бюлетэні прозвішча дзеючага прэзідэнта. Гэта відавочна. І тое, што працэнт галасавання па краіне быў вельмі блізкім да абвешчанага Ярмошынай, наводзіць на сумныя развалжанні.

Дарэчы, сённяшнія скрыўленні ў правядзенні выбараў у нашай краіне — гэта спадчына савецкай сістэмы.

Хачу звярнуць увагу вось яшчэ на што.

Здавалася б, што ў правільным падліку галасоў выбаршчыкаў павінны быць аднолькава зацікаўлены і кіраўніцтва краіны, і апазіцыя. Але калі апошняя імкнецца паралельна з участковымі выбарчымі камісіямі падлічваць галасы пры выхадзе выбаршчыкаў з выбарчых участкаў, ім чыняцца жорсткія перашкоды. Іх дзеянні расцэньваюцца як імкненне да захопу ўлады.

А колькі робіцца перашкод для таго, каб не дапусціць непажаданых асоб з той жа апазіцыі ў выбарчыя камісіі, пазбавіць іх права быць зарэгістраванымі ў якасці кандыдатаў у дэпутаты! Для гэтага адшукваюцца розныя дробязныя прычыны, на якія, на здаровы сэнс, не варта было б звяртаць увагу...

Я катэгарычна супраць папярэдняга галасавання, асабліва падчас прэзідэнцкіх выбараў, калі адны і тыя ж кандыдаты балатуюцца на ўсіх выбарчых участках краіны і кожны выбаршчык можа прагаласаваць на любым з іх па адмацавальным талоне. Аднак калі такое ўсё ж адбываецца, то датэрмінова прагаласаваць можна дазволіць толькі тым, хто ў дзень выбараў будзе знаходзіцца па-за межамі краіны, і гэта будзе засведчана адпаведнымі дакументамі (камандзіровачнымі пасведчаннямі, праязнымі білетамі). Волевыяўленне грамадзян забяспечваецца таксама выклікам членаў выбарчых камісій на дом, калі ў дзень выбараў выбаршчыкі па якой-небудзь прычыне не змогуць прыйсці на выбарчыя ўчасткі. Такім чынам, без датэрміновага галасавання можна абысціся. І калі такое адбываецца, то гэта камусьці патрэбна. Сцвярджэнне ж Ярмошынай, што датэрміновае галасаванне ўведзена ў інтарэсах выбаршчыкаў, не мае пад сабой падставы.

Каб незалежным назіральнікам аблегчыць кантроль за вынікамі галасавання і пазбегнуць усемагчымых плётак наконт гэтага, на кожным выбарчым участку мэтазгодна мець вось такую даступную для іх інфармацыю:

1.колькі на ўчастку ўсяго зарэгістравана выбаршчыкаў;

2.колькі з іх прагаласавала датэрмінова;

3.колькі чалавек дадаткова ўключаны ў спіс выбаршчыкаў у дзень галасавання;

4.колькасць выбаршчыкаў, якія прагаласавалі непасрэдна на дадзеным участку (з улікам тых, хто прагаласаваў датэрмінова).

Вырашыць гэтае пытанне можна адпаведным распараджэннем Цэнтральнай выбарчай камісіі, не ўносячы дапаўненні ў палажэнне аб выбарах. І незразумела, чаму лідэры адпаведных партый не дамагаюцца ад Цэнтрвыбаркама прадстаўлення ім гэтых, не падлягаючых засакрэчванню, звестак.

А.Г.Лукашэнка любіць запэўніваць нас у тым, што ён душой і сэрцам за тое, каб выбары ў нас былі бездакорнымі, справядлівымі. Каб на самай справе яны былі такімі, кожнаму беларусу трэба не на словах, а на справе рашуча адстойваць дэмакратычныя прынцыпы пабудовы сваёй краіны. Але пакуль што мы паўтараем заганную савецкую практыку правядзення выбараў.

А можа, у нас усё ж такі штосьці зменіцца ў лепшы бок?

Міхаіл ЖУКАЎ, пенсіянер, ветэран працы.

г.Баранавічы.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Виктор ДРЕНЮК:

«Не исключено, что идет передел рынка поставки соков...»

Более двух недель в СИЗО находятся сотрудники фирмы "Владпродимпорт", которая торговала соком "Садочок". В пакет именно из-под этого сока, напомним, было спрятано устройство, взорвавшееся в Минске 4 июля.

На днях родственники задержанных передали письменное обращение к главе Администрации президента Владимиру Макею и госсекретарю Совета безопасности Юрию Жадобину.

По словам родственников задержанных, вначале представители "Владпродимпорта" подозревались в совершении преступления, предусмотренного статьей 339 "Хулиганство" Уголовного кодекса Беларуси. Когда заканчивался их срок содержания под стражей, данная статья была переквалифицирована в статью 243 "Уклонение от уплаты сумм налогов, сборов" Уголовного кодекса Беларуси.

Для справки: ООО "Владпродимпорт" занимается импортом продовольствия. В компании работает более 400 сотрудников.

В редакцию "Народной воли" пришел отчим регионального представителя "Владпродимпорта" в Барановичах **Виктор Дренюк.**

"Парень только начал работать в Барановичах, вначале он трудился торговым агентом в Бресте, а затем ему предложили переехать в Барановичи и возглавить региональное представительство, — рассказал Дренюк. — *После того как в Минске случился взрыв, в фирме "Владпродимпорт" начались проверки. И когда с этим соком все закрутилось, их стали вызывать на допросы по поводу взрыва. Потом начались налоговые проверки. И вот 8 августа моего сына и представителя Брестского филиала вызвали в УВД Бреста. Они поехали. Потом он сообщил мне, что его уже везут в Минск (это уже было вечером). Я перезвонил следователю, и он сказал, что ему приказано доставить их в Минск. Ни его, ни мои возражения против этой поездки в расчет не принимались. А в Минске их уже не отпустили домой, а отправили в изолятор временного содержания по подозрению в особо злостном хулиганстве, связанном со взрывом. Фактически его и директора Брестского филиала похитили. По предмету задержания ему за все эти 10 дней не было задано ни одного вопроса. Правда, затем с них сняли обвинения в хулиганстве и обвинили в уклонении от уплаты налогов. Хотя мой сын к уплате налогов вообще не имел никакого отношения!*

Я сам бывший милиционер. И, глядя на всю эту историю, могу предположить: не исключено, что идет передел рынка поставки соков..."

Чего хотят от чиновников?

"Народная воля" приводит лишь некоторые выдержки из обращения родственников задержанных сотрудников "Владпродимпорта" на имя Макея и Жадобина.

"В ходе расследования уголовного дела по факту взрыва, произошедшего в ночь с 03 на 04.07.08 г. в г. Минске, органами дознания только потому, что взрывное устройство было заложено в пакет от сока, который поставлялся в Республику Беларусь, в том числе и фирмой "Владпродимпорт", задержаны и заключены под стражу 12 сотрудников этой фирмы.

